
ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

СМІ ў БЕЛАРУСІ

№ 1 (54) 2018



Вынікі 2017 года

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Вынікі медыйнага года ў лічбах

101 колькасць затрыманых журналістаў у 2017 годзе


69 колькасць штрафаў журналістам-фрылансерам за супрацу з замежнымі СМІ без акрэдытацыі

24 235 ЕЎРА агульная сума штрафаў журналістам за супрацу з замежнымі СМІ


47 млн ЕЎРА сума фінансавання дзяржаўных СМІ на 2017 год з рэспубліканскага бюджэту



Штрафы журналістам па арт. 22.9 КаАП



Выдаткі з дзяржаўнага бюджэту на падтрымку СМІ



17 колькасць папярэджанняў Міністэрства інфармацыі сродкам масавай інфармацыі (7) і інтэрнэт-рэсурсам (7) (аднаму – двойчы, і аднаму – тройчы)

106 колькасць рашэнняў Міністэрства інфармацыі аб абмежаванні доступу да інтэрнэт-рэсурсаў

194 агульная колькасць рашэнняў Міністэрства інфармацыі пра абмежаванне доступу да інтэрнэт-рэсурсаў, пачынаючы з 2015 года, калі міністэрства атрымала такое права

320 колькасць інфармацыйных матэрыялаў, у якіх у 2017 годзе Рэспубліканская камісія па ацэнцы інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці / адсутнасці ў ёй прыкметаў праяваў экстрэмізму знайшла прыкметы праяваў экстрэмізму

Становішча ў сферы СМІ ў 2017 г. (агляд)

Заяўленая ў Беларусі лібералізацыя эканамічнага і культурнага жыцця не закранула сферу выказвання меркавання, як і іншыя сферы, звязаныя з захаваннем грамадзянскіх і палітычных правоў. Больш за тое, 2017 год аказаўся адным з найбольш цяжкіх для беларускай незалежнай журналістыкі за апошні час. Горшым становішча было толькі ў поствыбарчым 2011 годзе.

Гэтак, калі ў 2016 годзе БАЖ зафіксаваў 13 выпадкаў кароткачасовых затрыманняў журналістаў падчас выканання імі сваіх прафесійных абавязкаў, то за 2017 год – 101 выпадак. У 10 з іх журналісты былі арыштаваныя на тэрмін ад 10 да 15 содняў. У асноўным затрыманні праводзіліся ўвесну падчас правядзення ў Беларусі масавых акцыяў пратэсту. Пасля завяршэння "Гарачай вясны - 2017 года" колькасць затрыманняў журналістаў таксама паменшылася.

У сакавіку 2017 года пасля амаль гадавога перапынку аднавіўся судовы пераслед журналістаў за супрацу з замежнымі СМІ без акрэдытацыі. Ён працягнуўся і пасля сканчэння пратэставых акцыяў. Як след, колькасць штрафаў журналістам-фрылансерам у 2017 годзе рэзка ўзрасла – 69 выпадкаў проці 10 у 2016 г. Гэта больш, чым за тры папярэднія гады разам узятыя. Агульная сума штрафаў перавысіла 25 тысячаў еўра.

Журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі медыямі, штрафуюць на падставе пратаколаў, складзеных міліцыяй паводле адвольна трактаванай імі часткі 2 арт. 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якая прадугледжвае



адказнасць за незаконны выраб і/ці распаўсюд прадукцыі СМІ. Падобная практыка распачалася з траўня 2014 года. За 2014–2016 гг. журналісты былі аштрафаваныя паводле гэтага артыкула 48 разоў. Ва ўсіх выпадках падставай для прыцягнення іх да адказнасці стаўся не змест іх матэрыялаў, а сам факт іх з’яўлення ў замежных СМІ. У большасці выпадкаў пераследуюцца журналісты, якія супрацоўнічаюць з тэлеканалам “Белсат”. Гэты тэлеканал уваходзіць у структуру Польскага тэлебачання, але пазіцыянуе сябе як першы незалежны тэлеканал Беларусі.



31 сакавіка ў двух офісах, дзе працавалі журналісты, звязаныя з тэлеканалам “Белсат”, міліцыя зладзілаператрусы і канфіскацыю абсталявання. ГУУС Мінгарвыканкама патлумачыла гэтыя дзеянні абаронай правоў на таварны знак па заяве праваўласніка.

ГА “БАЖ” у сваёй заяве ад 3 красавіка звязалаператрусы і канфіскацыю абсталявання з намерам уладаў спыніць дзейнасць незалежных тэлежурналістаў у краіне, асабліва падчас масавых акцыяў пратэсту.

Абвінавачанні ў незаконнай супрацы з замежнымі СМІ без акрэдытацыі прагучалі таксама ў крымінальнай справе супраць трох беларускіх аўтараў шэрагу расійскіх СМІ Юрыя Паўлаўца, Дзмітрыя Алімкіна і Сяргея Шыптэнкі (гэтак званая справа “рэгнумаўцаў”). Першапачаткова ім было прад’яўленае абвінавачанне ў распальванні нацыянальнае варажнечы па частцы 3 арт.130 Крымінальнага кодэкса Беларусі, які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 5 да 12 год. Падставай для ўзбуджэння справы стаўся зварот у Следчы камітэт з боку Міністэрства інфармацыі пра наяўнасць у публікацыях гэтых аўтараў прыкметаў праявы экстрэмізму.



Пазней дваім з фігурантаў справы было дадаткова высунутае абвінавачанне паводле артыкула пра незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, да якой следства прыраўняла атрыманне ганарараў з рэдакцыяў расійскіх СМІ. (Пазней пракурор выключыў гэты артыкул з абвінавачання праз недаказанасць сумаў, якія былі атрыманыя абвінавачанымі.) У кастрычніку 2017 г. справа была перададзеная ў суд. Абвінавачаныя знаходзяцца пад вартай больш за год – з моманту затрымання ў снежні 2016 года.

REPORTERS WITHOUT BORDERS FOR PRESS FREEDOM

“Рэпарцёры без межаў” адзначалі, што “артыкулы гэты трох блогераў з’яўляюцца спрэчнымі, але гэта не апраўдвае іх зняволенне. У адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі іх часовае затрыманне з’яўляецца ані неабходным, ані прапарцыйным”. https://rsf.org/en/news/rsf-calls-release-three-belarussian-bloggers



28 верасня, незадоўга да перадачы справы “рэгнумаўцаў” у суд, у Беларусі быў зменены міністр інфармацыі. Новым міністрам быў прызначаны Аляксандр Карлюкевіч. У адрозненне ад сваёй папярэдніцы Ліліі Ананіч, А. Карлюкевіч мае вялікі досвед журналісцкай і рэдактарскай працы.

У першым публічным выступе на новай пасадзе ў эфіры нацыянальнага дзяржаўнага тэлеканала “Беларусь 1” А. Карлюкевіч паведаміў пра падрыхтоўку новай рэдакцыі Закона “Аб СМІ”, закліканую забяспечыць дзяржаўнае рэгуляванне інтэрнэт-рэсурсаў і сацыяльных сетак.

Неўзабаве пасля гэтага паводле рашэння Мінінфарма ў пазасудовым парадку быў блакаваны папулярны інтэрнэт-рэсурс “Беларускі партызан” (belaruspartisan.org), створаны вядомым журналістам Паўлам Шараметам, які трагічна загінуў у 2016 годзе.

Мяркуецца, што прычынай абмежавання доступу да сайта на тэрыторыі Беларусі сталіся каментары

яго наведнікаў. Уласнікі сайта перайшлі на іншую даменную зону і адключылі функцыю каментавання. У цяперашні час доступ да сайта belaruspartisan.by застаецца адкрытым.

Асноўным станоўчым вынікам 2017 г. сталася вяртанне ў дзяржаўныя сеткі распаўсюду дзевяці незалежных друкаваных перыядычных выданняў, якія былі выкінутыя з шапікаў “Саюздруку” і падпісных каталогаў “Белпошты” 11 год таму.

Гэта стала непасрэдным вынікам сустрэчы галоўнага рэдактара газеты “Народная Воля” Іосіфа Сярэдзіча з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, якая адбылася ў лютым 2017 года. І. Сярэдзіч перадаў кіраўніку дзяржавы спіс з дзевяці выданняў, якія не могуць трапіць у тую ці іншую дзяржаўную сетку распаўсюду СМІ. Прэзідэнт паабяцаў вырашыць гэтую праблему.



Амаль 20 незалежных грамадска-палітычных газетаў былі выключаныя з дзяржаўных сістэмаў распаўсюду 11 год таму, напярэдадні прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Тады РУП “Белпошта” адмовілася ўключаць выданні ў падпісныя каталогі, а прадпрыемствы “Саюздруку” – прадаваць іх праз газетныя шапікі. Скасаванне дамоваў з рэдакцыямі незалежных газетаў матывавалі, як правіла, эканамічнай немэтазгоднасцю. У выніку гэтых дзеянняў каля паловы з закранутых перыядычных выданняў спынілі сваё існаванне ў друкаваным выглядзе. У 2008 годзе на хвалі пацяплення адносінаў паміж Беларуссю і ЕС “Белпошта” і прадпрыемствы “Саюздруку” аднавілі супрацу з газетамі “Народная Воля” і “Наша Ніва”. Пры гэтым шмат якія дыскрымінаваныя выданні спынілі свой выхад да 2017 года.

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

2018

Выдавец:
ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
БЕЛАРУСЬ, 220004, Мінск,
вул. Кальварыйская, 16-265

Тэл.: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98.
E-mail: press@baj.by
Web: www.baj.by

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч,
старшыня ГА «БАЖ»